

**ДАБРЫНІНА Данута Васільеўна**
**(1940г.)**

Нарадзілася ў вёсцы Горна на Зэльвеншчыне. Закончыла Зэльвенскую СШ №1, пасля філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працавала настаўніцай у школах Зэльвенскага і Ваўкавыскага раёнаў.

Першыя вершы былі надрукаваны ў Зэльвенскай і Ваўкавыскай раённых газетах. Піша на беларускай і рускай мовах.

Аўтар зборнікаў вершаў “Васільковае поле” (1999 г.), “С любовью к вам” (2000 г.), “Речкой Горнянкой к тебе бегу” (2002 г.), “Думак світанак” (2005 г.), “Влюблённая и.. безумно одинокая” (2007 г.).

Працавала ў Гомельскім абласным інстытуце ўдасканалення спецыялістаў адукацыі і кіруючых кадраў. Дацэнт.

У 2002 годзе Гродзенскае тэлебачанне паказала дакументальны фільм пра яе творчасць.

Жыве ў Гомелі.

**Бібліяграфія**


1. **Вядомыя постаці Зэльвеншчыны**: буклет / Склад. Н. У. Сончык. — Зэльвенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, 2008. — 10 с.
2. **Дабрыніна, Д. Думак світанак: лірыка** / Данута Дабрыніна. — Зэльва, 2005. — 60 с.
3. **Данута Дабрыніна //** Зоры над Зальвянкай: зборнік вершаў / Літ. аб’яд-не “Зоры над Зальвянкай”. — Слонім: Слонімская друкарня, 2008. — С. 27—29.
4. **Зэльвенскі зарапад //** Марціноўскі, П. М. Каб не пагаслі зоры: Артыкулы. Успаміны. Лісты. Вершы / Петр Марціноўскі. – Мінск: Ковчек, 2022. — С. 12—17.
5. **Масюк, В. Л. Уславіла Зэльвеншчыну** // Славуты Зэльвенскі край: матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі “Старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” (Зэльва, 12 снежня 1998 г.) / Рэдкал.: Д. С. Аляшкевіч ( гал. рэд.) і інш. – Ліда: ГАУПП “Лідская друкарня”. - 2004. – С. 327—330.